Тэма нумару: **Птушыны грып , ці аперацыя “Ы”**

**Аб пагрозе птушынага грыпу ў Беларусі вядзецца размова на ўсіх узроўнях. Вядзецца дэтальна і падрабязна, як пры падрыхтоўцы да сапраўднай вайны.**

стар. 4-5

Факультэт біялогіі і экалогіі ГрДзУ імя Янкі Купалы

# Pro Nobis*

Першая экалагічная газета | №2(6) | ВЯСНА 2006 | Распаўсюджваецца бясплатна

## Гракоў не прагнаць !

Парк Жылібера вядомы не толькі сваім цікавым гістарычным мінулым. Сёння, калі плануюць прагулку ў парку, абавязкова думаюць і пра тую “небяспеку”, што можа напаткаць пад раскідзістымі шатамі тамтэйшых дрэў.



Некаторы час таму камунальныя службы спрабавалі паменьшыць гэтую небяспеку: з дапамогаю спецыяльнай тэхнікі здымалі птушыныя гнёзды з дрэваў. Тым часам у Польшчы гэтую праблему вырашаюць усталяваннем спецыяльных гукавых прыбораў, што палохаюць птушак.

**Вольга Сташко**

*Каментар*

**Сябра АПБ Вінчэўскі Зміцер Яўгенавіч** наступным чынам каментуе спробы пазбавіцца ад непажаданых суседзяў: “ Аптымальных метадаў барацьбы з гракамі, што гняздуюцца ў парку, няма. Ніякія спецыяльныя прыборы для палохання не дапамогуць: калі для птушак няма рэальнай небяспекі, то яны вернуцца. Птушкі ж прыстасоўваюцца да людзей. Але чалавек разумнейшы за жывёл. Навошта зараз безвынікова здымаць іхнія гнёзды, калі раней можна было падумаць і размясціць лаўкі не пад дрэвамі, а ў іншых месцах”.

## Упершыню за 20 год



**І залікоўка не дапамагла**

**Упершыню за 20 год студэнты-пяцікурснікі факультэта біялогіі і экалогіі атрымалі чатыры нездавальняючыя адзнакі на дзяржаўных іспытах, што прайшлі ў апошнія тыдні красавіка.**

Чатыры дзяўчыны са спецыяльнасці “Біялогія”, што мелі сярэдні бал за пяць год навучання каля “4”, на дзяржіспыце атрымалі двойкі. Адна з іх вучылiася на платнай аснове. Дзяўчаты атрымаюць свой дыплом, магчыма, толькі праз год.

“Я ніяк не магла паверыць у тое, што камісія ўсё ж вырашыла паставіць двойку – да апошняга моманту не заносіла яе ў пратакол,” – кажа сакратарка камісіі аб падзеях дня, калі было атрымана першае “нездавальняюча”.

У студэнтаў розных груп былі неаднолькавыя камісіі. Старшынёй камісіі біёлагаў быў Лялевіч У. В. – па спецыяльнасці біяхімік. Не ўратавала нават тое, што на іспытах у складзе камісіі прысутнічала дэкан факультэта.

У выніку: эколагі абышліся нават без троек; сярод групы біяхімікаў – таксама толькі “добра” і”выдатна”; заолагі ж з батанікамі па-братэрску падзялілі чатыры двойкі, абмежаваўшыся адной пяцёркай на 20 з гакам чалавек.

Такі выпадак здарыўся ўпершыню за 20 год існавання біялагічнага факультэта. Апошнюю двойку, як успамінаюць выкладчыкі, атрымаў каля 8 год таму хлопец, якога проста не дапусцілі да дзяржіспытаў, бо ён не здаў зімовую сесію.

У чэрвені адбудзецца абарона дыпломных праектаў. Ці дазволяць дзяўчынам абараняць свае працы, пакуль невядома.

**Студэнт**

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

# Газетная газета

**Газета «Pro Nobis» заняла першае месца ў намінацыі « Лепшы дызайн» па выніках універсітэцкага конкурса газет, якія былі падведзены 5 мая ў залі гістарычнага музея ГрДзУ імя Янкі Купалы.**

У мерапрыемстве ўдзельнічалі 11 выданняў з розных факультэтаў. У намінацыі "Лепшае асвятленне здаровага ладу жыцця" перамаглі філолагі; юрыдычны факультэт першы ў адлюстраванні студэнцкага жыцця; пра дзейнасць маладзевых арганізацый лепш за ўсіх расказвае газета "Унісон" факультэта эканомікі і ўпраўлення. Газета біёлагаў і эколагаў "Pro Nobis" не засяроджваецца на "асвятленні" аднаго з бакоў жыцця, затое мае лепшы дызайн і з'яўляецца адзінай ва універсітэце газетай цалкам на роднай мове.

Бадзюкова Т. А., якая узнагароджвала прадстаўнікоў рэдакцый, адзначыла: "Газета "Pro Nobis" найбольш падобная на газету".

Арганізатарам конкурса з'явіўся аддзел выхаваўчай працы універсітэта. У склад журы ўвайшлі: кіраўнік гэтага аддзела Грынь А.А., прарэктар па выхаваўчай працы і сацыяльным пытанням Бадзюкова Т.А., намеснік рэдактара часопіса


ДИПЛОМ

Награждается

Газета "ProNobis" лепшая па дызайну

"Веснік ГрДзУ" Богуш А.В., рэдактар газеты "Гродзенскі Універсітэт" Вашкелевіч Н.В. і інш.

Па звестках метадыста выхаваўчага аддзела, узнагароды размяркоўваліся наступным чынам: для пераможцаў асноўных намінацый (прыведзены вышэй) былі падрыхтаваны грашовыя прэміі ў 25 тысяч беларускіх рублёў; для астатніх сямі – новыя кубкі для гарбаты ці кавы.

Такім чынам, ніхто не застаўся без увагі, што, безумоўна, дасць стымул для далейшага развіцця універсітэцкай прэсы.

**Вольга Сташко, Анастасія Раманоўская**

## Слова рэдактара



Дваццатая гадавіна Чарнобыльскае трагедыі нічым асаблівым не адрозніваецца ад мінулых: усе СМІ разам перапісваюць старыя матэрыялы, робяць рэпартажы з дзіўнымі фотаздымкамі, бяруць інтэрв'ю, адным словам – ПОМНЯЦЬ. Помняць аб "гераізме" і "мужнасці" нашага народа, які святкаваў першамай на далоні нябачнае смерці; які труціўся ад бязмернага панічнага ўжывання ёду праз адсутнасць хоць якіх-небудзь парад спецыялістаў; які жыве ў забруджанай зоне "на самым чыстым месцы на Зямлі"; які цярпеў знявагі ад вышэйшага кіраўніцтва краіны. Кіраўніцтва, якое баялася, каб, крый Божа, не спыніць запланаваныя пастаўкі мяса і збажыны, і што ім было да радыяцыіі, якая не крычала і не пагражала іх пасадзе. Помняць аб "непрафесіяналізме" спецыялістаў, якія былі накіраваны з ТЭС працаваць на АЭС, а потым паслухмяна выконвалі загады па здзяйсненню ваеннага эксперымента на АЭС мілітарнага тыпу. Што ёсць гераізм і мужнасць?

Ці стануць дваццатыя ўгодкі пачаткам адліку канца ваенных эксперыментаў на людзях? Ці будуць дзеці нашых дзяцей?..

# Універсітэт за чысты горад – 2

**Студэнты нашага універсітэта зноў збіралі смецце, на гэты раз на ўзлеску насупраць вуліцы Дамброўскага.**

29 красавіка а 10 гадзіне раніцы прадстаўнікі амаль усіх факультэтаў сабраліся на прыпынку "Фарты", каб збіраць смецце ля Інстытута біяхіміі. Колькасць валанцёраў была значна меншай (блізу 50 чалавек) у параўнанні з мінулай акцыяй. Праз хвілін пятнаццаць арганізатары накіравалі іх самаход у іншае месца, да ўзлеска каля былога завода "Вясёлка", што месціцца па вуліцы Дамброўскага.

"Думалі прыбіраць ля Інстытута біяхіміі, але ўчора студэнты біяфака былі там. Пагэтаму давялося трохі змяніць планы", - тлумачыць неспадзяванае рашэнне адзін з кіраўнікоў акцыі Грынь А.А. Арганізатарамі выступалі Адміністрацыя універсітэта, БРСМ, Прафкам студэнтаў ды Студэнцкае самакіраванне.

Як аказалася, на новым месцы смецця таксама хапала. У выніку амаль паўтарыгадзіннай працы студэнты назбіралі велізарную кучу смецця, якую потым пагрузілі на машыну ды адвезлі на звалку. Так універсітэт уносіць сваю пасільную лепту ў добраўпарадкаванне горада і падвышае свой аўтарытэт сярод яго жыхароў.

Нагадаем, што гэта другая экалагічная акцыя пад лозунгам "Універсітэт за чысты горад" , якую ладзіў ГрДзУ імя Я.Купалы. Першая (больш масавая) прайшла мінулай восенню. Тады студэнтаў аддзячылі экскурсіяй у Белавежскую пушчу.


Смецця хопіць на ўсіх

Ці паедуць куды-небудзь альтруісты гэтым разам, арганізатары пакуль не паведамляюць.

**Віктар Валько**

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

# Чарнобыльская катастрофа і ўлады.

**Чарнобыльская катастрофа і ўлада - і праз 20 год ёсць праблема для здароўя многіх тысячаў беларусаў і іх нашчадкаў.**

Найлепшы спосаб ацаніць рэальную сітуацыю небяспекі ці бяспекі на тэрыторыі Беларусі, звязаную з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС – гэта параўнаць аб'ектыўныя лічбы і дзеянні. Прапаную вашай увазе толькі некаторыя з іх.

Па-першае,усяго забруджаных радыянуклідамі плошчаў ( па цэзію-137 як маркернаму ізатопу) у Беларусі – 46500 км кв., у Украіне – 37600 км кв. А памеры плошчаў ( тыс. га ), што выведзеныя з эксплуатацыі ў сувязі з немагчымасцю атрымліваць прадукцыю патрэбнай якасці (па радыянуклідах) наступныя:




| Забруджанасць Кі/км кв. | Дзеянні дзяржавы | |
|---|---|---|
| | Беларусь | Украіна |
| 1-5 | Зона пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем | Зона павышанага радыяцыйнага кантролю |
| 5-15 | Зона з правам на адсяленне | Зона гарантаванага адсялення |
| 15-40 | Зона наступнага адсялення | Зона абавязковага адсялення |
| звыш 40 | Зона першачарговага адсялення | - // - |

Гэта пры тым, што высоказабруджаныя землі ў асноўным знаходзяцца на нашай тэрыторыі... А Homa sapiens амаль ідэнтычны па біялогіі і устойлівасці да радыянуклідаў на любой тэрыторыі. Прычына вынікае сама – яўная неідэнтычнасць законаў, нормаў і правілаў, якія прынятыя іншымі, кіруючымі Homa sapiens.

Цяпер, што тычыцца дзеянняў. Уважліва паглядзіце на наступную інфармацыю (у табліцы) і ацаніце, якія адносіны да здароўя сваіх грамадзян у кіраўнікоў Беларусі і Украіны.

**"140000 беларусаў жывуць у забруджанай зоне таму, што 20 гадоў чакаюць "наступнага адсялення"... "**

У Беларусі на тэрыторыях з забруджанасцю 15 – 40 Кі/км кв. пражывае ( чытай выжывае) амаль 140000 чалавек, а ў Украіне – толькі 3000...

Такім чынам, 3000 украінцаў жывуць у зоне абавязковага адсялення таму, што не захацелі з'ехаць, а 140000 беларусаў – таму, што 20 гадоў чакаюць "наступнага адсялення"... Няўжо дачакаюцца ?!

**В.С.Лучко**

## *Эксперымент спецыяліста*

**В.Б.Несцярэнка, сябар-карэспандэнт НАНБ, прафесар, доктар тэхнічных навук, дырэктар Інстытута радыяцыйнай бяспекі "БЕЛРАД".**

"Інстытут у снежні 1999 г. і студзені 2000 г. правёў абследаванне на СІЧ жыхароў 45 вёсак. Аналіз атрыманых дадзеных паказаў, што дозавые нагрузкі жыхароў гэтых вёсак зніжаныя ў 2-8 разоў.

Вымярэнні на СІЧ больш 55 тысяч дзяцей у Чарнобыльскіх рэгіёнах Беларусі выявілі высокі і небяспечны ўзровень назапашвання цэзія-137 у іх арганізме. Так, некаторыя дзеці маюць узроўні назапашвання цэзія-137 у арганізме да 3500-4000 Бк/кг (Дублін Брагінскага р-на), да 2000-2200 Бк/кг (Палессе Чачэрскага р-на), і нават да 6700 - 7300 Бк/кг (Кіраў, Хільчыха Нараўлянскага р-на). Па дадзеным Гомельскага медінстытута, у дзяцей пры ўзроўні назапашвання цэзія-137 у арганізме больш за 50 Бк/кг наступаюць незваротныя паталагічныя парушэнні жыццёва неабходных сістэм (эндакрыннай, імуннай, сардэчна-сасудзістай), печані, нырак, сэрца і вока. Таму пры перавышэнні ўжо 15-20 Бк/кг неабходна правядзенне радыяцыйнай абароны дзяцей.

Гэтыя вынікі паказваюць, што існуючая сістэма радыяцыйнай і сацыяльнай абароны насельніцтва ад наступстваў катастрофы на ЧАЭС, мякка кажучы, недастатковая. Пагэтаму патрабуюцца тэрміновыя меры па паляпшэнню заканадаўчай базы: у першую чаргу ўвядзенне дозавай мяжы для дзяцей роўнай 0,3 мЗв/год; потым узмацненне жорсткасці дапушчальных узроўняў утрымання цэзія-137 у асноўных дозаўтваральных прадуктах сілкавання для дзяцей (1-18 гадоў) да 50-70 Бк/кг (як у Расіі і Ўкраіне); таксама ўключэнне ў рацыён сілкавання дзяцей пектынстрымліваючых харчовых дабавак і правядзенне рэгулярнага (2-3 разы на год) кантроля на СІЧ утрымання цэзія-137 у арганізме дзяцей."

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

# Птушыны грып , ці аперацыя "Ы"

**Як кажуць, не было бяды, дык грып знайшоўся. Аб пагрозе птушынага грыпу ў Беларусі вядзецца размова на ўсіх узроўнях. Вядзецца дэтальна і падрабязна, як пры падрыхтоўцы да сапраўднай вайны. Часам дзеянні і рашэнні такія камічныя, што пачынаюць выглядаць як паніка.**

## Даеш краіне аб'явы!

Мабыць, толькі лянівы жыхар Беларусі не бачыў памятку для насельніцтва аб птушыным грыпе, дзе размешчана фотка страшных сініх курыных ног. Некаторым мясцовым уладам гэтага падаецца мала. Таму яны, як сапраўдныя ўдарнікі сваёй працы, паказваюць зайздросны спрыт у распаўсюдзе самаробных аб'яў, якія не адрозніваюцца такім каларытам і каляровасцю, затое перамагаюць у колькасці.

Але нават такім тыражом аб'яў справа далёка не скончваецца. Яшчэ былі прынятыя наступныя захады па барацьбе з птушыным грыпам:

### 1. Хатні арышт

У Гродна эпідэміёлагі правялі пагалоўную вакцынацыю хатняй птушкі. На ўласных падворках горада налічылі каля 7000 "галоў". Для кожнай быў падрыхтаваны асобны шпрыц. Але няшчасці кур, гусей і качак працягваліся: ім прыйшлося круглымі суткамі сядзець па куратніках, пакуль не скончылася міграцыя пералётных суродзічаў.

Такі ж лёс напаткаў і тых жыхароў гродзенскага заапарку, што на сваю бяду з'яўляюцца птушкамі. Па звестках ветэрынарнага ўрача гэтай установы, не ўсе перанеслі прывіўкі без страт. Папугаі выявіліся самымі неўстойлівымі да такіх паспешлівых мер – шмат птушак падохла.

### 2. «Падпішысь, што азнаёмлены!»

Сёння ўсім прадпрыемствам грамадскага харчавання неабходна выконваць новыя санітарныя нормы. Частка з іх, па словах супрацоўніцы аддзела гандлю і грамадскага харчавання гродзенскага гарвыканкаму, знайшла адлюстраванне ў наступных дакументах:

1) палажэнне "Аб парадку атрымання і захоўвання мяса птушкі";

2) памятка "Меры па прафілактыцы грыпа птушак".

Факт азнаямлення з апошнім дакументам павінны пісьмова падцвердзіць усе супрацоўнікі прадпрыемстваў грамадскага харчавання, што маюць кантакт з птушкай. Акрамя таго, такая памятка павінна вісець у кожнай краме ў аддзеле рэалізацыі птушынага мяса ці ў залі самаабслугоўвання.

Памеры паставак курынага мяса ў Гродна не змяніліся ў параўнанні з мінулым годам. Такія звесткі падае вышэй названы аддзел.

Ці сталі жыхары Гродна меньш купляць курынае мяса, адсачыць складана, паколькі, па словах кіраўнічкі аддзела статыстыкі рознічнага гандлю гродзенскага гарвыканкаму, улік продажу мяса вядзецца агульны, без падзелу яго на ялавічыну, свініну, кураціну ці іншы від.




**Памятка для насельніцтва ў прыгарадным цягніку**

*Меркаванне спецыяліста*

**Сітуацыю каментуе прафесар, аўтар кніг па вірусалогіі Паўловіч С. А.**

Можна сказаць адназначна, што сам вірус птушынага грыпу для чалавека бяспечны, бо ён не мае роднасці да эпітэлія верхніх дыхальных шляхоў чалавека. Набыць такую здольнасць ён зможа толькі пры рэкамбінацыі з вірусам грыпу чалавека. Такая з'ява ўжо назіралася ў гісторыі. Пандэміі, што былі выкліканыя рэкамбінантным вірусам, назіраліся ў 40-я, 50-я, 70-я гады.

## 3. Усё па плану

Сайт аддзела эпідэмнагляда за інфекцыйнымі і паразітарнымі захворваннямі падае Комплексны план мерапрыемстваў па прафілактыцы птушынага грыпу на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на 2006 год. Гэты дакумент зацверджаны прэм'ер-міністрам РБ Сідорскім С.С. і сагласаваны з міністрам с/г і харчаванняРБ, а таксама з галоўным дзяржаўным санітарным урачом РБ. Вось некаторыя яго пункты:

| № п/п | Мероприятие | Срок исполнения | Ответственный исполнитель | Соисполнители |
|---|---|---|---|---|
| 2.7. | Организовать проведение мероприятий по отпугиванию дикой птицы от мест гнездования с использованием различных методов в населенных пунктах, расположенных на берегах водоемов | Март-апрель | Местные исполнительные и распорядитель-ные органы | Минприроды МВД |
| 3.5. | Запретить свободный выгул домашней птицы во всех населенных пунктах | С 01.03.2006 г. и до особого распоряжения | Местные исполнительные и распорядитель-ные органы | Минсельхозпрод |
| 7.5. | Проверить укомплектованность медикаментами для лечения птичьего гриппа палат интенсивной терапии в инфекционных отделениях больниц | Январь-март | Минздрав | |
| 7.10. | Обеспечить рестораны и буфеты пассажирских поездов дальнего следования мясом птицы и птицепродуктами только отечественного производства | С 01.01.2006 г. и до особого распоряжения | БелЖД | |




## «Не бойцеся, грыпу няма»

Думкі аб птушынай хваробе не абмінаюць і галоў простых грамадзян нашай краіны. Давялося бачыць наступны выпадак на гродзенскім рынку: людзі доўга разглядаюць мarожаных кур на прылаўку; жанчына, што прадае, каб заахвоціць да пакупкі, кажа: "Бярыце курачак! Не бойцеся, у іх грыпу не было."

У нашай краіне "усё добра". І зніжэнне коштаў на птушынае мяса ўсярэднім на 300 рублёў за кілаграм зусім не звязана з вірусам птушынага грыпу. "Я па тэлебачанню бачыла. Казалі, што проста выйшаў указ аб зніжэнні коштаў, каб людзям нядорага купляць было", - гэтак растлумачыла нам прадавачка на Грандзіцкім рынку.

У любым выпадку, кожны вырашае сам: паддавацца агульнай паніцы і патрабаваць пасведчанне аб тым, што набытая Вамі кура "отечественного производства", ці падоўжыць сабе жыццё на колькі хвілін за кошт здаровага смеху.

**Вольга Сташко, Віктар Валько**

## Апытанне

### Што ёсць для Вас птушыны грып?




**36% - сацыяльная рэклама**
**36% - рэальная небяспека**
**12% - чарговая плётка**
**12% - іншае**
**4% - мяне гэта не цікавіць**

**Каб высветліць, як да з'явы птушынага грыпу ставіцца маладое пакаленне, мы правялі апытанне сярод студэнтаў свайго факультэта. На пытанне "Што для Вас птушыны грып?", было прапанавана 4 варыянты адказаў і вольны радок для ўласных дум.**

З 25 чалавек абыякавым да прадмету размовы выявіўся толькі адзін – ён лічыць, што птушыны грып "далёка". 36% рэспандэнтаў бачаць у вірусе "рэальную небяспеку". Такую ж колькасць прыхільнікаў мае сфармуляваная намі тэза аб тым, што птушыны грып – гэта сацыяльная рэклама. 12% студэнтаў-біёлагаў і эколагаў скептычна ставяцца да прапаганды і называюць хваробу птушак "чарговай плёткай". 12% апытаных маюць асабістыя думкі, што выходзяць за межы прапанаваных варыянтаў, таму аб'яднаныя ў групу "іншае". Найбольш цікавай сярод "іншага" бачыцца заўвага аб тым, што птушыны грып – гэта "тое, на чым нехта няблага зарабляе".

Маладыя, як заўжды, вызначаюцца разнастайнасцю і супярэчлівасцю думак.

**В. В., В. С., Д. Г.**

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

## Каб “жаба не душыла”

*Гелена Белязюн*

**Жабы, рапухі, трытоны інстынктыўна выклікаюць у сучаснага чалавека пачуццё агіды, нават сваім знешнім выглядам. Аднак, нашыя продкі ставіліся да іх з пашанай.**

Жаба, з аднаго боку, атаясамлівала ся з адраджэннем, пладавітасцю; з другога – разглядалася як хтанічная істота, звязаная з містычнымі падземнымі і воднымі сусветамі. Ва ўяўленні славянскіх народаў жаба разглядалася як “ператвораны” чалавек; гэты матыў быў адлюстраваны ў вядомай казцы пра Каралеўнужабу.

Сувязь жабы і рапухі з хтанічным светам нарадзіла павер’і аб тым, што яны выклікаюць захворванні людзей і прыносяць вялікую шкоду. Адсюль, напрыклад, і такія назвы,



Жаба душыць насамрэч так

як “грудная жаба”. Некаторыя з павер’яў – гэта сумесь паняццяў аб рэальнай біялогіі земнаводных і магіі: людзі верылі, што забіццё жабы выклікае дождж, дотык да яе – бародаўкі на скуры чалавека; попел саламандры можа атруціць чалавека і г. д. Многія з такіх недарэчных перасцярог дайшлі і да нашых дзён.

А вось сельскія жыхары звычайна мелі рэалістычныя ўяўленні аб земнаводных. Гэта адлюстроўваецца у многіх народных назвах: “вадзяная яшчарка” для трытонаў, “баравая жаба” для рапухі, “кумка” для жэрлянкі і г. д. Славянскія жанчыны клалі рапух, квакшаў у скрыні з малаком, каб яно не кісла.

Дзякуючы нашым продкам, а дакладней, укладу іх жыцця, веры, назіральнасці ў прыродзе, захаваліся многія прадстаўнікі жаб, рапух і трытонаў. Сучаснаму чалавеку яшчэ многае патрэбна пераняць, зразумець, асэнсаваць. Яму трэба з сённяшняга дня пачаць адносіцца да гэтых жывёл так, каб пасля “жаба не душыла”.

# Цікавыя людзі: біёлаг, што падарожнічае ў часе

**Найбольш цікавым для кожнага чалавека з'яўляецца яго асаба. А як наконт людзей, якія знаходзяцца побач? Мы ведаем іх імя, ведаем іх у твар, а далей? Мы вырашылі весці пастаянную рубрыку аб неардынарных зацікаўленасцях студэнтаў і выкладчыкаў нашага універсітэта.**

Першым нашым героем стаў студэнт IV курса факультэта біялогіі і экалогіі – Леанід Кітус. Сярод яго інтарэсаў гістарычныя танцы, ролевы рух, разьба па дрэву і маляванне.

**“Pro nobis” (“PN”):Чаму ты вырашыў займацца менавіта гістарычнымі танцамі, а не, напрыклад, брэйк-дансам?**

Леанід: Гістарычныя танцы вяртаюць да мінулых часоў. Гэта цікава, калі танцуеш так, як танцавалі раней.. Напрыклад, бранлі (заходне-еўрапейскія сярэднявечныя гарадскія танцы), джыга, алеманды (прыдворныя сярэднявечныя танцы) і іншыя. Для танцаў мы выкарыстоўваем шатландскую, ірландскую музыку і музыку сярэднявечча. Гэта нашмат цікавей і разнастайней, чым брэйк-данс.

**“PN”: А што ж такое ролевы рух?**

Гэта нешта падобнае да драмгуртка, але са сваёй спецыфікай. Мы ніколі не атрымліваем сцэнар, дзе для кожнага ўсе словы распісаны. Нас інфармуюць толькі, якая роля і якая эпоха. Таму, акрамя таго, што патрэбна зрабіць строй, азнаёміцца з эпохай, яшчэ неабходна прадумаць варыянты дзеяння.

**“PN”: Ролевы рух неяк уплывае на твой светапогляд? Ці адбываецца экстрапаляцыя пачуццяў, учынкаў, якія адбываюцца на сцэне, на сапраўднае жыццё?**

Так, безумоўна. Ролевы рух развівае уменне прымаць рашэнні ў нестандартных сітуацыях. Напрыклад, табе гавораць, што ты



Леанід у старажытным строі

будзеш селянінам, у якога ўкралі дачку, і яе абавязкова трэба вызваліць,а ў цябе няма грошай. Вось і прыходзіцца імправізаваць усім дзеючым асобам адразу, прымаць рашэнні проста па ходу гульні.

**“PN”: У якой эпосе ты б не хацеў апынуцца насамрэч?**

Мне не падабаецца наогул тэхнаэпоха, калі намаганні людзей зводзяцца толькі да таго, каб вырабіць суперзброю. Не падабаецца сярэднявечча – рыцары не па мне. У іх атрымлівалася нейкае жыцце ўчатырох: рыцар, афіцыйная жонка, дама сэрца ды яшчэ і каханка. Можна было б усіх гэтых жанчын спалучыць у адной.

**“PN”: Што б ты хацеў змяніць у людзях сённяшняга часу, гледзячы на іх праз прызму светапогляду сучаснага біёлага, які мае магчымасці “падарожнічаць” у часе?**

Я лічу, што нічога не патрэбна змяняць. Так усё і павінна быць. Усё зробіць эвалюцыя.

**Анастасія Раманоўская**

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

# “У сераду не смейся, у нядзелю не плач”



*Вольга Сташко*

**Сімволіка дзён у народнай культуры беларусаў з'явілася задоўга да прыходу на нашу зямлю хрысціянства. Кожны дзень тыдня меў свае асаблівасці, забароны, пажаданні. Хрысціянская вера паўплывала і на гэтую частку вераванняў беларусаў. Дні тыдня, акрамя старых павер'яў, сталі несці і рэлігійную афарбоўку. Так, самымі вызначальнымі днямі тыдня сталі серада, пятніца, субота і нядзеля, што звязана з біблейскімі падзеямі.**

## Панядзелак (Цяжкі)

**Павер’і.**

Не пажадана садзіць курыцу на яйкі, таму што могуць вывесціся адны пеўнікі. У ноч з панядзелка на аўторак можна зачаць хлопчыка.




Шлях, з якога не выкінеш ані дня

## Аўторак

**Пажаданні.**

У гэты дзень можна было:

1) смела адпраўляцца ў далёкую дарогу;

2) хадзіць у сваты – не атрымаеш “ад варот паварот”.

**Павер’і.**

Чалавек, што нарадзіўся ў аўторак, пражыве доўгае і шчаслівае жыццё.

## Серада

Сярэдні дзень тыдня лічыцца нешчаслівым, посным, таму што якраз у сераду Іуда здрадзіў Ісусу Хрысту і выдаў яго.

**Забароны.**

У гэты дзень нельга:

1) хадзіць у сваты;

2) бяліць печ;

3) прасці;

4) купаць дзяцей.

## Чацвер (Чысты)

**Пажаданні.**

У гэты дзень добра:

1) распачынаць зажынкі;

2) саліць або квасіць прадукты харчавання.

**Павер’і.**

Каб на працягу года быць багатым, толькі ў чацвер трэба стрыгчы пазногці.

## Пятніца (Параскева)

У адпаведнасці з евангельскай традыцыяй, Хрыстос быў укрыжаваны менавіта ў гэты дзень. Таму гэты дзень, гэтак сама, як і серада, посны. Але пятнічны пост больш жорсткі.

**Забароны.**

Па народных уяўленнях, па пятніцах нельга:

1) купаць дзяцей;

2) прасці і араць, “каб не запыліць матухну-Пятніцу і не засыпаць ёй вочы кастрыцаю і пяском”.

## Субота (Радзіцельская)

**Пажаданні.**

У суботу трэба было:

1) прыбіраць у хаце;

2) ушаноўваць продкаў.

## Нядзеля (Святая)

Святочнасць гэтага дню відна ўжо з назвы: “не для дзела”, “ня-дзелай”. Гэта дзень уваскрашэння Ісуса Хрыста.

**Забароны.**

На кожным сёмым дні тыдня нельга займацца шматлікімі жаночымі справамі: шыць, вязаць, прасці, ткаць, сукаць ніткі, купаць дзяцей і мыць бялізну.

**Пажаданні.**

Затое ў нядзелю добра было:

1) праваздзіць засяўкі;

2) збірацца на сенакос;

3) першы раз выганяць скаціну ў поле;

4) закладваць падваліны новай хаты.

**Павер’і.**

У беларусаў існавала перакананне: дзіця, якое нарадзілася ў нядзелю, будзе валодаць незвычайнымі здольнасцямі, яго нельга сурочыць ці навесці на яго шкоду. Пажадана, каб маці з дзіцем упершыню выйшла з хаты менавіта ў гэты дзень.

Беларусы шанавалі кожны з дзён тыдня і намагаліся не парушаць усталяваных продкамі звычаяў і норм паводзін. Можа таму нашыя продкі ведалі жыццё глыбей і ставіліся да яго, як да шляха, з якога нельга выкінуць ані дня.

# Беларускае вяселле: “Лавіць зайца”

Да нашага часу ў вясельным абрадзе захаваўся звычай “лавіць зайца”. Ён заключаецца ў тым, што як толькі маладыя ўязджаюць у вёску, а ў гарадох – на сваю вуліцу, ім перагароджваюць дарогу: ставяць скамейку або стул, на якім ляжыць хлеб, святая соль і стаіць вядро з вадою. Робяць гэта чужыя людзі. Сват павінен даць “чэсным людзям” пачастунак (бутэльку гарэлкі), за што тыя перадаюць маладым “хлеб-соль”, зычаць шчасця і акрапляюць вясельную дружыну вадою.

Гэты абрад мае двухсэнсавае значэнне:

1) У больш старажытныя часы дзяўчыну за пэўны выкуп прадавалі ў сям’ю хлопца. У перыяд племяннога суіснавання, калі дзяўчыну з аднаго племені не аддавалі за хлопца з другога, ён выкрадаў яе. Тады яго называлі “зайцам”. Родзічы дзяўчыны лавілі такога ўцекача-зайца, каб сілаю ўзяць хоць які выкуп за сваю сястру ці дачку.

2) У гэтым звычаі захавалася спрадвечнае добразычлівае жаданне нашых продкаў-славян сустрэць новую сям’ю хлебам-соллю і з святой вадою, каб ёй добра жылося.

*Працяг у наступным нумары*

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

## Лета разам з Вяртлявай Чаротаўкай



Калегі, запрашаем прыняць удзел ва ўліках Вяртлявай Чаротаўкі (ВЧ) у Польшчы. Улікі будуць праводзіцца на Бебжы - найбуйнейшым месцы гнездавання ВЧ у Польшчы і Заходняй Еўропе.

Калі вы ведаеце тых, хто зацікавіўся ўдзелам, калі ласка, паведаміце нам аб гэтым. Лепш за ўсё, хай звяжуцца са мною і азначаць, у які з ніжэй пададзеных тэрмінаў яны жадаюць прыняць удзел ва ўліках. Удзельнікам павінна быць 18 і больш гадоў. Час знаходжання ў летніку павінен быць не меншы за тыдзень.

**Віктар Фянчук** (Інстытут Заалогіі НАН Беларусі, Мінск)
**ggrzywaczewski@op.pl**
**fenchuk@tut.by**
**I летнік -15.05-20.05**
**II летнік - 21.05-27.05**
**III летнік - 28.05-3.06**
**IV летнік - 4.06-10.06**
**V летнік - 11.06-17.06**

## Гісторыя адной качкі

*Эпізод першы*



*Эпізод апошні*



**Віктар Валько** (рэдактар)
**Гелена Белязюн** (журналіст)
**Анастасія Раманоўская** (карэспандэнт)
**Вольга Сташко** (нам. рэдактара)
**Дзмітрый Гупянец** (карэспандэнт, вёрстка)
**Яўген Баркоўскі** (карыкатурыст)

## Сусветная павуціна



**http://belarustourism.by/ru/**

Набліжаецца пара вакацыяў, пара адпачынку. Сайт belarustourism.by прапануе максімум інфармацыі аб тым, як і дзе правесці лета. Сярод прапаноў не толькі Турцыя, Балтыка, Егіпет і інш., але і родная Беларусь з аднаўленымі Нясвіжам, Мірам, Аўгустоўскім каналам («хіт сезона») і інш.




**http://mamb.ru/lib/**

Увесну вучыцца цяжка. Яшчэ цяжэй выседзець усе да адной лекцыі, калі за вокнамі такая прыгажосць і цеплыня. Але ж лекцыі ў канспекце самі сабой не пішуцца.

Наступны сайт можа дапамагчы студэнтам у пошуках рознай біялагічнай інфармацыі. На яго старонках можна знайсці біялагічныя падручнікі па розных дысцыплінах: генетыка, гісталогія, эвалюцыя, і нават іх спампаваць (бясплатна!).

**Дзмітрый Гупянец**

Факультэт біялогіі і экалогіі ГрДзУ імя Янкі Купалы
Pro Nobis*

Галоўны рэдактар: **Віктар Валько**
В□рстка: **Дзмітрый Гупянец**
Аб'ём: 1 умоўна друкаваны аркуш
Наклад 150 асобн□ка□
Выдавец: факультэт б□ялог□□ □ экалог□□ ГрДзУ
Надрукаваны на абсталяванн□ выда□ца
Адрас рэдакцы□: вул. Даватара, 3/1
Нумар падп□саны □ друк: 22.05.2006
Вашыя артыкулы вы можаце дасылаць на E-mail: **pronobis2004@mail.ru**